# Алёна ПАПКО

## Крыгі

Паэма



Папко Алёна нарадзілася 24 лютага 1990 года ў вёсцы Сакалова Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт замежных моў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Працуе настаўніцай.
Вершы друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Нёман» і «Маладосць». Лаўрэат рэспубліканскага літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча ў намінацыі «Паэзія», дыпламант абласнога літаратурнага конкурсу сярод дзяцей і юнацтва, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Брэсцкай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### I

Завей-вей-вейны сон
Кране пагожы будзень:
Стаю, а з двух бакоў
Не дрэмлюць
снежань, студзень.

Душы, што горкі мёд,
Няведамы пакуты...
Скрыпіць бліскучы лёд,
І студзень кліча ў люты.

### II

Галінкі рабін усыпаны снег-снегірамі,
Чырвоныя грудкі распушаны іх вятрамі.
Снег-снег-снегірок,
сябры мы няўзнак з табою,
Бо выпала ўсё ж нарадзіцца і мне — зімою.
Суботнім дзяньком,
калі поўдзень быў дужа цёплым,
Не сцюжа — сонца ласкава заглядвала ў вокны.
Пазней рой сняжынак аколіва пры-цярушыў...
Снег-снег-снегірок ў дарожаньку спешна рушыў.

### III

Начыста-чыста сатруць
Сляды вір-вір-завірухі,
Дзеі-надзеі ўзлятуць,
Пераадолеўшы скруху.

Шлях Млечны —
зор зорны ўзор —
Недасягальны. Вух-вух.
Па-над вячэрняй зямлёй
Ляціць наўздагон снежны пух.

## IV

Дзень зіхатлівы мой,
Каханне — чуйным рэхам.
Я — тут! Бяжы за мной.
Сардэчную прарэху
Загой яго рукой —
Гой-гой...
                Так выпадкова,
Магчыма, гэта сон.
Глядзі, якое мора!
І хваляў плёс-плёс-плёск,
Каменьчык — у далоні.
Бур-бурлівы паток,
Што накрывае скроні.
І побач, побач ён,
І ямачкі пры ўсмешцы...
Куды падзеўся сон?
На памяць — галавешкі.

## V

Відаць, ніколі ім не ўжыцца:
Агню стыхіі і вады.
Ён будзе к полымю хіліцца,
Яна — к дажджам. І так заўжды.

У зорнай лёсу крутаверці
Між імі мройны ледаход.
Быць аднаму з іх вечна першым,
Другому — біцца ўсё аб лёд.

## VI

Яшчэ гарчыць той боль навідавоку.
Куды яго? Пад рэбры камяням?
Ці, не міргнуўшы аксамітным вокам,
На пераплаўку майстрам-кавалям?

Цягнік дыхне натужліва-тужліва.
У добры шлях пад рэзвых колаў бег.
Сардэчнага апёку сарамліва,
На жаль, у жніўні не астудзіць снег.

Таму гарчыць той боль навідавоку,
А я дасюль стаю на санцапёку...

## VII

Пачакай адпускаць...
Пачакай.
Тых імгненняў зіхоткага сонца
Нашы смех, і любоў,
І адчай,
Кроплі-кропкі
Чаргою бясконцай.

Адпускаць пачакай...
Адпускаць
Дужа лёгка —
Цяжэй зноў сустрэцца,
Бо адлегласць, разводзячы нас,
З карты сэрцаў і душ
Не сатрэцца.

## VIII

Дождж!.. Далоў парасон — гул зрывае.
Важкія кроплі — на твар.
Дождж!.. Так лёгка пачуцці змывае
Без даўняй тугі праяў.

Новае сэрца, чыстае сэрца
Прыму ад яго я ў дар.
Вобраз, каханы, ў ім твой сатрэцца
Пад шэрай заслонай хмар.

Мы немінуча станем чужымі,
Далёкімі ў свеце зор,
У сэрцы крыштальным, ведай, астыне
Мая да цябе любоў.

Дождж!.. Суседскія ліпы прамоклі.
Жвава бягуць ручайкі.
Холад далоні праніжа — кроплі
Скаваліся ў ледзякі.

## XIX

На тым прыстанку
                              боль з прасветам.
Гукай вясну, смалісты бор!
Зарубцаванаму Сусвету
Калыскай стаць для новых зор.

# Ягор ЖУКОЎСКІ



## Жніво — праца цяжкая

Дыялог з прызнаннем

Жукоўскі Ягор нарадзіўся 15 жніўня 1996 года ў Мінску. Скончыў факультэт транспартных камунікацый Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (2018). Аспірант кафедры «Аўтамабільныя дарогі» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.
Удзельнік і пераможца літаратурных конкурсаў: рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі «Аўтограф», універсітэцкага літаратурна-паэтычнага конкурсу «Муза ў тэхнічным інтэр’еры» і інш.

— О, гэта зноў вы? А я лічыў, што нашы сустрэчы ўжо скончыліся.

— Я гэтаксама лічыла,— млява прамовіла Смерць.

— Дык вы хочаце аб гэтым пагаварыць? — спытаў псіхатэрапеўт.

Сустрэч Смерці з псіхатэрапеўтам даўно ўжо не было. Звычайна праца Смерці не вымагала непасрэднага яе ўдзелу: усё рабілі яе памагатыя, а яна толькі зацвярджала справаздачы за месяц. Ды нават калі і патрабавалася якая дапамога, то ніякіх складанасцей і непаразуменняў не было: тыя, да каго яна прыходзіла, з пакорай прымалі свой лёс.

Яе кар’ера пачалася прыкладна тады, калі Бог з Д’яблам вырашылі стварыць угоду.

— Богу богава, Д’яблу д’яблава,— вырашылі яны і ўдарылі па руках.

Гэта было слушна: людзі, якія, здавалася, павінны былі стаць вяршыняй цывілізацыі, амаль нічым не адрозніваліся ад іншых жывёл. Прынцып, паводле якога ствараўся Сусвет,— праведнікі трапляюць у Вырай, а грэшнікі — у Пекла,— ужо не працаваў. Сталася так, што ў Выраі пуста, а ў Пекле месца вольнага не было. І да таго ж аксіёма аб бяссмерці душы была прызнана памылковай: утрыманне такой колькасці жывых душ памерлых вымагала вялікай колькасці рэсурсаў.

Для вырашэння гэтых цяжкасцей было прапанавана стварыць Апраметную з Забыццём: хопіць судзіць па справах — кожнаму аднолькавы канец. Менавіта дзеля арганізацыі гэтай справы і была запрошана найлепшая калісьці ткалля — Смерць.

— Што вас прывяло гэтым разам?

— Зноў старыя справы,— з цяжкасцю адказала яна.— Мне здавалася, што ўжо ўсё тое насенне параслo.

Лёс чалавецтва моцна падобны да нівы. За жыццё чалавек павінен зрабіць нешта карыснае і даць пасля сябе шмат параст-

каў. Папраўдзе гэта і ёсць ніва. Але ніхто тое насенне не рыхтаваў: што сеялі, то і атрымлівалі.

Пасля той угоды Бог з Д'ябалам правялі апошнюю сяўбу. Рабілася гэта, каб можна было ў рэшце рэшт запоўніць як належыць Вырай і зрабіць ратацыю ў Пекле — хочацца не хочацца, а гаспадарку трымаць трэба.

— Гэта тое насенне, з якога нарадзіліся святыя і пачвары?

— Менавіта. Парасткі з таго зерня, якія наш варштат не мог апрацоўваць. Гэта ўжо потым, пад кіраўніцтвам Арахны, мы пачалі рабіць палотны, каб забяспечваць гаспадарку нашых дырэктараў.

— Наколькі я памятаю, вам было не так і цяжка ў той час.

— І так і не,— узгадвала Смерць.— Тая праца была цяжкая маральна. Мая праца была простая: адвесці душу памерлага да Пётры, а там ён сам ужо займаўся дакументамі. Складанасці былі ў тым, што кожны ведаў будучы лёс сваей душы і за той час, пакуль я суправаджала іх, мне даводзілася слухаць іх казанні. На жаль, амаль кожны з іх памёр не сваёй смерцю. Усе як адзін яны спявалі, што прынялі тую пакутніцкую смерць у імя свайго патрона, яны намагаліся давесці пра іх літасць. Чамусці кожны верыў, што менавіта Бог ці Д'ябал апекаваўся над імі да апошняй хвіліны і што менавіта яны, у знак удзячнасці, будуць ім прыслугоўваць. Я добра ведала намеры нашага начальства, але згодна з кантрактам не магла распавесці ім праўду. Але маё сумленне казала мне рабіць іншае. Я рабіла злачынства. Злачынства думак.

— Гэта прыблізна як здаваць сваю карову на мяса?

— Прыблізна тое адчуванне, але, у адрозненне ад людзей, да каровы ты прывязваешся.

— Дык а чаму вы не накіравалі сваіх падначаленых?

— Такія ўмовы кантракту: я асабіста адказваю за апошні Гасподнеў надзел.

— Дык што, вы зноў у працы?

— Гэта ўсё сяўба. Акрамя таго, што Бог пасеяў сваё насенне, а Д'ябал сваё, дык яны яшчэ дзеля разваг і высеялі нейкі гібрыд. Ні Богу свечка, ні Чорту качарга. Такого насення, мне здаецца, было не надта шмат. Да сённяшняга дня я лічыла, што іх было з калеў пяць.

— Чаму я раней не чуў пра гэтае? І што было з імі?

— Пра гэтых людзей забаронена казаць. Ім усім знайшлі нейкі занятак. Імя адной толькі можна зараз называць...

— І хто гэта? — перабіў псіхатэрапеўт.

— Ліліт.

— Ліліт! Тая? Першая жонка Адама?

— Якога Адама? — закаціла вочы Смерць.— Гэта ўсё чалавечыя выбрыкі. Не было яго ніколі. Я ж кажу, усё чалавецтва — адзін вялікі палетак, на якім вырошчваецца сыравіна для нашай карпарацыі. Але так, Ліліт тая. Мне невядома, чаму нябесная канцылярыя адкрыла яе бессмяротнае імя.

— А чаму вы не даведаліся пра гэта ў Пётры? Мне здаецца, вы знаёмыя.

— Ага, чакай ад таго Пётры.

— Але прычына візіту не Ліліт?

— Не, яна тут ні пры чым. А ці вядомыя вам парадкі ў Апраметнай?

— З большага...

— У нас усё сувора. Хаця нікога ўжо ў Вырай ці Пекла не накіроўваюць, але чалавек, а дакладней яго душа, уяўляе сабе ўсё гэта. Нават не самі справы таго чалавека, але і ўчынкі яго сям'і могуць паўплываць на гэта. Жыў ты ціха і сціпла, дык будзеш бачыць Спакой ды Вырай. Падманваў і абіраў гаротных — толькі Пекла і ў рэшце Забыццё. Але калі ты ўчыніў нешта такое, што ідзе супраць дзеянняў дырэктараў, то не будзе ні пекла, ні забыцця, як таму, што называў сябе царом.

— Я так і меркаваў,— сказаў суразмоўца з выглядам вялікага знаўцы.— А як душы памерлых трапляюць да варштата?

— Нічога складанага. Звычайна мае падначаленыя сустракаюць іх душы падчас фізічнага адыходу і праводзяць да бліжэйшага ўваходу ў Апраметную. Нашая фірма ўжо столькі гадоў працуе, што ўваходы месцяцца амаль у кожным раўчуку ці сажалцы. Далей іх чакае ладдзя. Ладдзя Роспачы. Гэта абумоўлена тэхналагічным

# Алена БРАВА

## Кава на пяску

Апавяданні



Брава Алена нарадзілася 18 жніўня 1966 года ў Барысаве. Дэбютавала ў 2002 годзе зборнікам вершаў, але пазней звярнулася да прозы. Яе аповесці, раманы, апавяданні друкаваліся ў беларускіх і замежных літаратурных выданнях, выходзілі ў многіх анталогіях. Аўтарка пяці кніг прозы, лаўрэатка шэрагу літаратурных прэмій. Крытыкі адзначаюць нязменныя якасці прозы пісьменніцы — эмацыйную шчырасць, паэтызаванасць стылю, псіхалагізм, які сягае ў глыбіні чалавечай свядомасці і падсвядомасці, увагу да сімвалічнага і метафарычнага асэнсавання рэальнасці.

### Канапа

Цяпер тут турагенцтва, і ля сцяны стаіць белая скураная канапа. Можаце адпачыць на ёй, разглядаючы гіпсавага сабаку, падобнага да шакала Анубіса, пакуль вам афармляюць пуцёўку ў Егіпет.

Калі вы пані за пяцьдзясят і пачыналі свой квітнеючы бізнес прадаўшчыцай на рынку недалёка (рынак і зараз ёсць), то, седзячы на белай штучнай скуры, раптам ды і ўспомніце — не без самазадаволенасці — іншую канапу, якая стаяла гадоў трыццаць таму на гэтым месцы. З абіўкай у жудасных карычневых ружах, з капай, запэцканай вінам і кавай. На кулявым століку магнітафон круціў плёнку, побач месціўся апарат для прыгатавання кавы на пяску. Госці гэтага ўтульнага кутка сыходзіліся ў меркаванні, што прасунуты каваапарат дужа нагадвае кашэчы латок.

Гэта была першая ў горадку прыватная PR-студыя. Адкрыў яе былы фатограф КБА Толік. Кава на пяску была эксклюзіўнай прынадай для мясцовых дзявуль з мэтай завабіць іх на памянёную канапу. І Любкі, Надзькі, Танькі, Зойкі ахвотна ўладкоўваліся на бруднаватай капе, не асабліва спадзеючыся, што іх паклічуць замуж. Выпіць кавы з цікавым мужчынам — адна з нямногіх радасцей, на якія ім хапала сіл паміж гандлем падробным тэфлонам у прадзьмутай наскрозь палатцы і цыганінай па аптовых рынках. Часам яны забягалі сюды проста з рабочага месца, папрасіўшы Машу-Кацю-Зіну прыгледзець за таварам. Калі гэта адбывалася ўзімку, даме патрабавалася хвілін дзесяць, каб зняць з сябе ўсё пухова-футрава-ваўнянае... а потым нацягнуць назад... вох, запорхаешся.

Без гарэмнага пакрывала і падушак канапа служыла для памяшчэння сядалішч кліентаў, народа дужа заклапочанага магчымасцямі, якія раптам адкрыліся. На піяр-паслугі, якія прадастаўляла студыя, пацягнуліся мясцовыя фрыкі, што кінуліся з балота алкагалізму ў не менш тваністае балота эзатэрыкі. Заходзілі сюды бухгалтар, які адкрыў у сабе дар экзарцыста, ва-

лютчык, што пазнаў сваю папярэднюю інкарнацыю на карціне Якобі. Заходжваў і бізнесовец Мусік, які марыў пра стварэнне партыі нудыстаў. У цэлым, разнашэрсная была публіка.

Толік вёў разлікі з кліентурай, а ўласна піярам загадвала журналістка Мілачка. Толік зманіў яе з раённага радыё, дзе яна выязджала на фермы з вялізным, як кардонка ад чаравікоў, касетным рэпарцёрам і вярталася змрочная, бо цярпець не магла пах гною. Марай Мілачкі было выйсці замуж у замежжа, дзе гною, на яе думку, не магло быць у прынцыпе. Цяпер яна істэрычна вяла перапіску з замежнымі жаніхамі, чые адрасы выvуджвала з газет шлюбных аб'яў. У яе эпісталярных раманах, як прамень святла ў цёмным царстве, акурат бліснуў сямідзесяцігадовы немец, які называў яе Meine liebe Prinzessin, падпісваў лісты Dein Prinz і ўжо высвятляў у Мілачкі памер пярсцёнка.

У адпаведнасці з логікай часу Толік вырашыў зарабіць. У сельгастэхніцы ён выпадкова знайшоў запчасткі, не патрэбныя мясцовым камбайнам і сеялкам ні пры якім надвор'і. Затое проста такі страсна жаданыя для расійскага аўтапрама, які страціў ланцужкі сувязяў з пастаўшчыкамі. Толік загрузіў запчасткі ў свае «жыгулі» і паехаў у расійскі горад. Дзе паміж справай выявіў краму матацыклаў, якія чамусьці не карысталіся попытам. Ён наняў фуру і адвёз матацыклы ў Беларусь. Неўзабаве Толік ужо гандляваў не толькі запчасткамі і матацыкламі, але і цукрам, ватовымі коўдрамі, парасонамі, мылам, селядцом, дзіцячымі калготкамі — вой, усё хіба запомніш.

Канапа ў студыі сірацела — цяпер Толік вадзіў у рэстараны дарагіх баб і здымаў кватэру на суткі ў былой цырульніцы, якая таксама сышла ў вольнае бізнес-плаванне. Так што дзяўчаты з рынку, згаладнелыя па моцнай мужчынскай пяшчоце, адчувалі сябе вельмі нават пакрыўджанымі на Анатоля. PR-бізнес таксама прасеў, Толік нават падумваў яго прадаць, з дадаткам у выглядзе Мілачкі. Ёй гэта было ўсё роўна: Мілачка ўжо атрымала ад пажылога жаніха запрашэнне на выезд. Яна папрасіла Толіка прывезці ёй з Масквы чорнае карункавае бодзі — такое Мілачка бачыла ў часопісе.

Але ў Толіка ў гэты момант пачаліся непрыемнасці. У цягніку ён пазнаёміўся з чалавекам, які меў сувязі на вядомым усяму быломy Саюзу аўтамабільным заводзе. Новы знаёмы прапанаваў браць машыны па заводскім кошце, а прадаваць — ну, гэта зразумела... Спачатку ўсё ішло гладка, потым напарнік запрасіў суму адразу на дзесяць аўто. Толік увайшоў у долю са шматлікімі, як ён казаў, сур'ёзнымі людзьмі, узяў у банку крэдыт. Сума была перададзена напарніку — з ёю той і знік. Назаўжды. Ішлі працэнты за крэдыт. Сур'ёзныя мужыкі ўключылі «лічыльнік».

Толік прадаў сваю долю ў магазінах, якія паспеў адкрыць, вярнуў частку грошай. Калі доўг дасягнуў 100 тысяч долараў, адправіўся ў лес, змайстраваў пятлю, але збаяўся і пайшоў да бандытаў. Тыя падумалі — і спынілі «лічыльнік» на ста тысячах.

Ён уладкаваўся ў Расіі ахоўнікам на мытні, там і жыў, падмяняў рабят на дзяжурствах, гатаваў ім ежу — вайсковы дзед наадварот. У адпаведнасці, зноў жа, з логікай часу на мытню напалі бандыты і абрабавалі фуру з нейкім асабліва каштоўным грузам. Сябры-ахоўнікі параілі беларусу знікнуць: з даўгамі ён — першы падазраваны. Толік залёг на дно. Праз некаторы час усплыў. Працаваў на будоўлі. Спраўна плаціў крэдыторам.

Аддаўшы чарговую частку грошай, з'явіўся ў студыі. Як ні дзіўна, ён не забыўся на Мілачкіну просьбу. Ну так, чорнае карункавае бодзі. Можа, прымерыш? На жарт Мілачка адрэагавала кісла. За гэты час яна паспела з'ездзіць да нямецкага прынца і вярнуцца дадому. Выявілася: такіх мілачак у яго не адна, прыязджаюць па чарзе. І гноем, дарэчы, там смярдзіць — ён у вёсцы жыве, уяўляеш?

Яны сядзелі на канапе, пілі каву па-ўсходняму. Мілачка звярнула ўвагу, што Толік неяк памужнеў, стаў цікавейшым, ці што. І шнар над пераноссем — у час дзяжурстваў на мытні засынаў і падаў тварам аб стол — яго ані не псуе. Цяжкасці гартуюць мужчыну, падумала Мілачка. Анатоль таксама адзначыў яе жаночую прывабнасць,

# Ліна МРАГІ

## Негабарытны груз

Апавяданне



Мрагі Ліна (сапр. Мігаль Ірына) нарадзілася 18 лістапада 1975 года ў Мінску. Паэтка і празаік. Друкавалася ў рэспубліканскай перыёдыцы. Аўтар рамана-фэнтэзі «Для смаку дадаць кары, альбо Каталізатар для планеты» (2021).

Дом развальваўся. Прытым проста на вачах. Адчыніўшы дзверы, Скот Лін атрымаў па галаве верхнім ашэсткам, а зрабіўшы крок, праваліўся ледзь не па калена скрозь прагнілыя дошкі, разадраўшы штаніну і ладна падрапаўшы нагу.

Лаячыся і праклінаючы сямейныя развалiны, ён пракульгаў на кухню да санітарнай шафкі. «Калі тут хоць нешта засталося... Няўжо з-за пары драпін давядзецца вяртацца ў горад?!» — скрушна падумаў ён, аглядаючы палічкі за некалі белымі дзверцамі з абшарпаным чырвоным крыжом. Але ў старой хатняй аптэчцы, што помнілася з ранняга дзяцінства, знайшоўся і антысептычны спрэй, хай і з даўно скончаным тэрмінам прыдатнасці, пажоўклы ад часу бінт, і нават рулончык пластыру.

Пакуль ён змываў кроў пад тонкім струменьчыкам жаўтлявай вады з пражавелага крана, займаючыся аказаннем першай дапамогі, і разглядаў сваю амаль пяцідзесяцігадовую, але цалкам сімпатычную і, як казала адна з яго даўніх сябровак, харызматычна-блудлівую фізіяномію ў мутнаватым люстэрку. Надвор'е сапсавалася. Неба за нямытымі вокнамі завалаклі хмары, і ў хаце значна пацямнела. Пашураваўшы ў камодзе і кладоўцы, Скот знайшоў пару старых буйнацокальных лямпачак — даўно такіх не бачыў.

Цьмянае, хісткае святло толькі дадало засмучэння ў асяроддзе. Абшарпаныя сцены з абвіслымі, некалі квяцістымі шпалерамі; невыноснае рыпэнне дашчаной, даўным-даўно нефарбаванай падлогі; бразготкія пад парывамі ветра, перакошаныя аконныя рамы — цвіль, волкасць, разруха. Хоць калісьці тут кіпела жыццё, пахла малаком і салодкай выпечкай...

Самыя яркія дзіцячыя ўспаміны Скота былі звязаны менавіта з гэтым домам. Як жа хутка сямейнае гняздо прыйшло ў занапад... Хоць справядліва кажуць, калі з

дому сыходзяць людзі, ён губляе душу і ператвараецца ў разваліны.

Увесь час пакуль бушавала навальніца, Скот прасядзеў у праламаным крэсле, аддаючыся ўспамінам. Вось ён хлапчуком бегае па стракатых дывановых дарожках з мадэллю «шатла» над галавой, а мама каля пліты пераварочвае духмяныя аладкі і пазірае то на яго, то на бацьку, які сядзіць за сталом з ранішняй газетай. А вось ён забягае на ганак, які цяпер зусім пакасіўся, з дыпломам каледжа ў руках, а вось... Гэты ўспамін не быў лепшым ці шчаслівым, ён быў балючым, але не менш яскравым, чым іншыя: Скот у новенькай форме астранаўта паведамляе бацьку аб першым, але вельмі доўгатэрміновым палёце.

Рудыя скалы Марса... Тытан... Ледзяныя пусткі Энцэлада... Арбіта Венеры... Пякучы жар Меркурыя... Дзе ён толькі не пабываў за час доўгай і небяспечнай службы! Але ўсё ніяк не забывалася тая аплявуха. Мама ўжо хварэла, а бацька заўсёды быў супернікам космасу. Ён часта паўтараў: «Што мы робім?! Навошта? Тут, на Зямлі, столькі працы, столькі нявырашаных праблем! Спачатку трэба навесці парадак ва ўласным доме, а ўжо потым лезці ў чужыя!»

Але космас вабіў. Клікаў Скота і іншых гэткіх жа маладых і амбіцыйных юнакоў і дзяўчат, якія прагнуць невядомых прыгод на бязмежных прасторах Сусвету. Але цяпер усё ў мінулым. Зоркі Скот будзе бачыць, толькі задраўшы ўгару галаву, а не праз ілюмінатары арбітальных станцый або звышмоцнае полікарбанатнае забрала скафандра. Усё. Спісаны. Нягодны. Больш не патрэбны. Не патрэбны нідзе. Нікому...

Скот ачомаўся ад віску тармазоў. Навальніца ўжо скончылася, а ў хаце добра адчуваўся свежы і п’янкі пах азону. Удыхнуўшы на поўныя грудзі, Скот вызірнуў у акно. Ярка-сіні «форд», зззяючы дажджавымі кроплямі, стаіць за брамкай на адной пятлі. «Цікава, якога ён года? А чорт яго ведае якога... З новых, мусіць, вунь цёмная паласа над коламі, сціснутая паветраная падушка — «форд-амфібія». Падобна, дарагая машынка...» — Скот не занадта добра разбіраўся ў сучасным зямным аўтатранспарце. А вось побач з аўто спадар з лакіраванай тэчачкай пад пахай.

— Містар Лін! Містар Лін! Мне сказалі, што вы тут! Я — Кроў з «Найноўшыя тэхналогіі, вытворчасць і ўтылізацыя»! Вельмі важная справа!

Праз некалькі гадзін, калі падкаціў бульдозер, а за ім грузавік з брыгадай працоўных, Скот амаль скончыў зборы. З дому ён забраў пару старых сямейных альбомаў, некалькі кніг бацькі і любімую маміну цукарніцу, якая нейкім цудам захавалася ў кладоўцы. Пасля смерці маці бацька прыбраў з вачэй усё, што нагадвала пра яе, але не выкінуў. Частку складаў у далёкую кладоўку, а нешта разабралі сябры і суседзі. Але гэтая цукарніца была асаблівай. Даволі вялікая круглая бляшанка са шчыльным вечкам і дагэтуль захаваўшымся яркім малюнкам па ўсім перыметры. Маленькі вясёлы касманаўт у шлеме з рожкамі-антэнамі нясецца верхам на вастраносай ракеце каля планет Сонечнай сістэмы: Марса, Юпітэра, кольцаў Сатурна, а на вечку — зялёная Зямля, абтыканая хаткамі ды кветкамі. Магчыма, менавіта гэтая старая бляшанка, якую Скот так любіў разглядаць у дзяцінстве, і падштурхнула да рашэння прысвяціць сваё жыццё космасу насуперак жаданню бацькоў, хто ведае...

Народу ў мястэчку значна паменела, і гэта было прыкметна адразу, як толькі Скот праехаў па вуліцах. Раней у гэты час сутак яшчэ снаўдаліся натоўпы моладзі, на ўсю моц насіліся аўто, гарэлі неонам шыльды крам і кафэ. Цяпер былая мітусня і яркасць адсутнічалі спрэс. Дзе-нідзе цьмянае святло ў акенцах, рэдкія прыпаркаваныя машыны, мінакоў амаль няма.

Зайшоўшы ў бар, Скот сеў на высокае крэсла. Вусач за стойкай уміг паставіў шклянку:

— Памацней?

— Як вы адгадалі?

Той паціснуў плячыма:

— Вопыт...

— Віскі, калі ласка...

Наведвальнікаў амаль не было. Двое мужчын сярэдніх гадоў у далёкім куце

АСОБА

# Васіль ЗУЁНАК

## Ля паэтычнага вогнішча

*Да 85-годдзя Уладзіміра Гніламёдава*



Уладзімір Гніламёдаў. 2017 г.

«Бываюць вершы празрыстыя, як тая рачулка, у якой відаць дно. Яны мілыя ў сваёй празрыстасці і яснасці і нават вабяць гэтымі сваімі якасцямі. Бываюць вершы іншага гатунку — глыбокія, шматзначныя, насычаныя мнагамернаю думкай. І гэта адна з абавязковых, незаменных уласцівасцей сапраўднай паэзіі — яе невычарпальнасць. У добрым вершы не відаць дна, а мастацкі вобраз нельга вычарпаць, ён, так сказаць, не перасыхае, сам час асвяжае яго змест...»

Пра паэзію,— і паэтычна, і шматзначна!.. Хто мог сказаць так? Толькі чалавек-творца, літаратар-крытык, даследчык з паэтычнай душой. А імя яго — Уладзімір Гніламёдаў.

Навуковы, даследчыцкі лёс Уладзіміра Гніламёдава ад самага пачатку быў пераважна падпарадкаваны Паэзіі. «Праблема традыцыі і наватарства ў сучаснай беларускай паэзіі» — гэта кандыдацкая дысертацыя Уладзіміра Гніламёдава; «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» — дысертацыя доктарская.

У царстве Паэзіі Уладзімір Гніламёдаў не выпадковы прышэлец. Ён тут чалавек свой і пажаданы. Чытаеш яго кнігу «Ля аднаго вогнішча» — і там, ля яго, у добрай сябрыне, у шчырай гамонцы, поплеч з Нілам Гілевічам, Рыгорам Барадуліным, Генадзем Бураўкіным, бачыш і Уладзіміра Гніламёдава. Ён суразмоўца, ён пільна назірае і заўважае самае цікавае, характэрнае ў гэтым паэтычным гурце. А сабралася тут ажно адзінаццаць творчых асоб, і кожная — індывідуальнасць. Характарыстыкі прысутных «ля вогнішча» падаюцца дакладна і пераканаўча. У кожным выпадку вызначаюцца вузлавыя моманты і вакол іх засноўваюцца, фармулююцца і замацоўваюцца штрыхі і дэталі паэтычных партрэтаў. А гэтая разнастайнасць творчых індывідуальнасцей, стылёвая шматфарбнасць зліваюцца ў адну цэласную паэтычную панараму — кнігу «Ля аднаго вогнішча».

Мастакоўская цікаўнасць Уладзіміра Гніламёдава да ўнутранага паэтычнага свету даследуемага аўтара заўсёды і прынцыповая і па-добраму абнадзейваючая.

Ксенія
ЗАРЭЦКАЯ

# Нявеста памірае двойчы

Яўген Карняг — адзін з лепшых сучасных беларускіх рэжысёраў. Яго спектаклі заўсёды поўныя ўнутранага драматызму і надлому, ён скрупулёзна разглядае чалавечыя жарсці і заганы. Але глядзіць на людзей не пад лупай, не як на насякомых, а быццам праз тэлескоп — як на сапраўдныя сусветы, цікавыя яму да вар'яцтва, загадкавыя і непаўторныя.

Нараджэнне, вяселле і смерць — заяўленая рэжысёрам трылогія. Пачаў ён апавяданне з сярэдзіны: «Шлюб з ветрам» стаў першай яго працай над гэтымі тэмамі. Сёлета прайшла і прэм'ера «Пачупак» — спектакля, у якім ён даследаваў нараджэнне.

У «Шлюбе з ветрам» раскрываецца тэма вяселля. Таго самага, традыцыйнага. Са звонам бутэлек, надрыўным плачам і надсадным рогатам, з танцамі і бруднымі заляцаннямі, з дзікім, першабытным запалам. Вяселле агорнута паганскімі абрадамі ледзь не мацней за смерць, а ўжо там, здавалася б, ёсць куды разгуляцца. Вяселле — злучэнне дзвюх сем'яў і двух родаў, злучэнне мужчыны і жанчыны, гэта і нараджэнне і смерць адначасова. Таму што паміраюць людзі свабодныя і нараджаецца новая сям'я. Вядома, усё гэта ўмоўнасці, якія ў сучасным свеце не вельмі прывячаюць, але магія застаецца, і пакуль нам не ўдалося ад яе збегчы.

Над «Шлюбам з ветрам» працавала зладжаная і прафесійная каманда. Таццяна Нерсісян выкарыстала для афармлення сцэны толькі тры колеры. Белы і чорны — асноўныя. Чырвоны — яркі акцэнт, менавіта з чырвоным звязана адна з самых жудасных гісторый, якая паўстала перад гледачом у загадкавым змроку. Чорна-белая палітра глядзіцца зусім не так, як у старых фільмах. Гэта не фільтр, павярхоўны і неглыбокі. Гэта сапраўдная філасофія. І чорныя касцюмы, чорныя сукенкі, чорныя каралі танчаць ледзь не дэманічнымі ценямі на чорным фоне. І белыя рукі, белыя ногі выглядаюць амаль мёртвымі на белым стале. Лётаюць чорныя вароны ў белых далонях, і рэзкія, злыя ліхтары скажаюць твары герояў, робяць іх «занадта чалавечымі». Такімі, што хочацца схавацца, толькі б не глядзець. Фізічна адчуваецца холад. Акцёры-госці здаюцца безабароннымі, як і нявеста ў тоненькай сваёй кашулі, і жаніх — практычна голы... Іх хочацца абараніць і атуліць, але неміласэрнае белае святло не дае схавацца і адвесці погляд.

Дзякуючы кампазітару і кіраўніцы праекту Каці Аверкавай глядач пачуў вялікую колькасць народных песень у сучаснай апрацоўцы. І гэтая повязь мінулага і сучаснасці — не толькі ў музыцы са змрочнымі яе напевамі: яна хаваецца ва ўсім і робіцца ўсё больш жахлівай з цягам часу. Са спектакля сыходзіш з пытаннем: «Ці памянялася нешта за гэтыя стагоддзі? ці настолькі значна змяніўся чалавек?» І адказ на яго здаецца адмоўным і несуцяшальным, і ўсё ж ёсць у гэтай глыбіннай старажытнасці небяспечная прыгажосць.

Вяселле пачынаецца з песні — для гледача, а для нявесты — з развітання. Дачка сыходзіць ад маці, і мама гэтая, якую сыграла заслужаная артыстка Беларусі Галіна Чарнабаева, дачушку сваю адпускае. Прыбірае яе ў сукенку вясельную, сучасную і прыгожую, толькі падобную на саван чамусьці. Абувае туфлікі на дачку, да валасоў яе вэлюм прычапляе. І дачка, перш чым сысці, ужо прыбраная і гатовая да новага жыцця, падае перад мамай ніцма, утыкаецца тварам у яе калені, і жэст гэты — апошняя яе спроба пазбегнуць сыходу. Маці спявае для яе развітальную пес-



ню і гладзіць дачку па валасах, а дачка за матчыны рукі хапаецца, хаваецца ў іх. А потым сыходзіць. Ёсць у гэтым дзеянні, у гэтай сцэне, нешта такое сумнае і цьмяна знаёмае, што хочацца плакаць, але слёз няма. Слёзы быццам мерзнуць унутры.

Якое вяселле без выпіўкі? Пляшкі з самагонкай граюць асобную мелодыю — бразгаюць, булькаюць, звіняць і пераліваюцца. І з'яўляецца на тварах людзей то нуда, то азвярэнне. Нявеста ўсё больш сумна выглядае, усё бліжэй да маці хіліцца галава жаніха. Нечакана сцэна абрываецца, і перад намі аказваюцца толькі ногі. Карняг яшчэ і харэограф, і ў яго ў спектаклях заўсёды шмат пластыкі і фізіялогіі, але прымусіць гледача сачыць за нагамі і бачыць вызначальны сэнс у рухах канечнасцей людзей — гэта верх майстэрства. Гэтая дасціпная сцэна разганяе трохі агульны змрок, і зноў захоўваецца ў ёй і дзікае і цывілізацыйнае, таму што на нагах — абутак, таму што ногі прадчуваюць і дзейнічаюць, але яшчэ яны бессаромныя і неразборлівыя. Дзіўная сцэна.

Наогул, галоўныя героі спектакля — гэта жанчыны, яны ў пануючай ролі. Проста таму, што менавіта жанчыны тут моцныя, у той час як мужчыны — натоўп і застаюцца ў рэшце рэшт толькі агульным нейкім фонам.

А яшчэ жанчыны прыгожыя. Нават у тузе сваёй, у гневе сваім і ў сваёй роспачы — яны цудоўныя, і назіраць за імі — хвалююча да дрыжыкаў.

Народная артыстка Беларусі Таццяна Мархель грае маці жаніха. Усё ў яе абліччы крычыць пра тое, што дзяўчыну яе сын абраў нявартую, і нават у валасах у яе — чорны шалік павязаны, як на пахаванні, нібы не жэніць яна свайго сына, а на той свет адпраўляе.

Ці ж табе, сыночак,
Кот вочы выдраў,
Па якіх ты ездзіў,
А якую выбраў?
А з яе ж ні складу,
А яна ж без ладу,
Яна ж ні з паходкі,
Яна ж ні з работкі.

Мама любіць свайго сына ашалела і жорстка. Мама свайго сына зрабіла слабым і інфантыльным, прывязала да сваёй спадніцы, прыкавала ланцугамі. А сын выбрацца і не хоча, яму і так добра. І сімбіёз іх — разбуральны для абаіх. Яго спрабуе разарваць нявеста-жонка, спрабуе змагацца за ўвагу мужа са свякрухай і кладзе на барацьбу гэтую ўсю сябе. Яна змірылася ўжо з тым, што якой бы прыгажуняй і разумніцай ні была, названай маме сваёй не спадабаецца, і толькі кідае сумныя